УДК 373.3.016:821.161.3

# ЖАНРАВА-ТЭМАТЫЧНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА ТВОРАЎ Г. П. АЎЛАСЕНКІ, ПРАПАНАВАНЫХ ДЛЯ ВЫВУЧЭННЯ НА І СТУПЕНІ АГУЛЬНАЙ СЯРЭДНЯЙ АДУКАЦЫІ

***Я. А. Чысцякова*** (МДУ імя А. А. Куляшова)
Навук. кір. ***Д. А. Доўгаль***,
дацэнт

У кола чытання малодшых школьнікаў уключаны творы сучаснага беларускага дзіцячага пісьменніка Генадзя Аўласенкі. Разгледзім дадзеныя творы ў жанрава-тэматычным аспекце.

Для чытання і вывучэння школьнай праграмай па літаратурным чытанні прапануюцца два творы аўтара. У раздзел “Жывая кніга беларускай прыроды” (2 клас школ з рускай мовай навучання) уключана казка “Сказ пра тое, як Алссік заблукаў аднойчы ў лесе”. Праз гэты твор настаўнік абуджае цікавасць вучняў да навакольнага асяроддзя і фарміруе беражлівае стаўленне да прыроды. У 3 класе ў раздзеле “Добрае дзіця бацькоў думкі згадвае” змешчаны верш “Чыя мама лепшая?”. Як вынікае з назвы, твор пакліканы фарміраваць у малодшых школьнікаў пяшчотныя і ласкавыя адносіны да матулі.

Для пазакласнага чытання ў праграме прапануюцца наступныя творы Г. П. Аўласенкі:

• у вершы “Клён” апісваецца хараство восеньскай прыроды;

• казка “Сказ пра Мураша-лайдака” вучыць малодшых школьнікаў быць стараннымі, працавітымі, заўсёды дапамагаць іншым;

• у вершы “Аб чым спяваюць птушкі?” распавядаецца пра прыгажосць вясновага прылёту птушак;

• верш “Хто як зімуе” знаёміць чытачоў з тым, як жывёлы ўладкоўваюцца на зімні перыяд;

• казачнае апавяданне “Як мухаморы вайну пачыналі” мае павучальны алегарычны змест: праз вобразы атрутных грыбоў выкрываецца нікчэмнасць і фанабэрыстасць;

• празаічная казка “Ганарлівая кветачка” вучыць дзяцей не быць эгаістычнымі і клапаціцца пра тых, хто знаходзіцца побач.

Адметным жанрам у творчасці Г. Аўласенкі з’яўляецца сказ – твор, у якім аповед вядзецца ад імя літаратурнага героя. Сказы Г. Аўласенкі (“Сказ пра тое, як Алссік заблукаў аднойчы ў лесе” і інш.) стылістычна імітуюць фальклорную манеру, змяшчаюць вымысел, таму ў вучэбных дапаможніках яны залічаны да казак.

Такім чынам, у праграме па літаратурным чытанні знайшлі адлюстраванне вершы, а таксама празаічныя і вершаваныя казкі (сказы) прыродазнаўчай і маральна-этычнай тэматыкі Генадзя Аўласенкі.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова